## § 34. Працяжнік у няпоўным сказе

1. Працяжнік можа ставіцца ў простых няпоўных сказах на месцы прапушчанага члена сказа, калі ў маўленні на месцы пропуску робіцца паўза: *Каля школы – прасторная хата з бурштыновых бярвенняў* (П. Панчанка). Калі на месцы

пропуску няма працяглай паўзы, то працяжнік не ставіцца: *Над полем полаг сінявата-шэрага змроку* (І. Навуменка).

2. Працяжнік можа ставіцца ў няпоўнай прэдыкатыўнай частцы складанага сказа на месцы пропуску таго ці іншага члена сказа, калі гэты член сказа прысутнічае ў папярэдняй прэдыкатыўнай частцы, а ў маўленні на месцы пропуску робіцца працяглая паўза: *У белым адзенні прыходзіць зіма, вясна – у зялёным адзенні* (П. Глебка). Калі ж у маўленні на месцы пропуску паўза не робіцца, то працяжнік не ставіцца: *Над ракой стаіць каліна, а над возерам вярба* (П. Трус).

> ☝ Працяжнік не ставіцца на месцы прапушчанага выказніка ў дадзеных параўнальных частках складаназалежнага сказа: *Рухалася пяро па паперы, як цяжкі воз па старой грэблі* (З. Бядуля).

**Практыкаванне № 68.** Прачытайце сказы, прааналізуйце іх структуру, растлумачце пастаноўку або адсутнасць знакаў прыпынку пры пропуску слоў.

1. Пясчаны шлях, насыпаны ўзбоч чыгункі, вядзе ў лес і ў мястэчка, прасёлкавая дарога – у мястэчка і ў поле (І. Навуменка). 2. Над галавой – высокае неба (І. Навуменка). 3. У суседнім пакоі – раяль (Б. Мікуліч). 4. Сцюдзёны вецер з усіх бакоў (М. Гарэцкі). 5. На ўскраі хвойніку – яр (Б. Мікуліч). 6. На краі неба – зарніца далёкай кананады (І. Чыгрынаў). 7. Шлюпкі – на вадзе (А. Звонак). 8. Чалавек, як трава да сонца, горнецца да лепшага (Кузьма Чорны).

**Практыкаванне № 69.** Запішыце тэкст, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Вусна растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў няпоўных канструкцыях, укажыце магчымыя пунктуацыйныя варыянты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лес пад бокам. Прайдзі на захад якую-небудзь вярсту па чыгунцы або па пыльным шляху які ляжыць побач і тут табе сасновы бор дзе чарніц і брусніц і грыбоў не абярэшся трохі злева змешаны лісцвяны лес у якім пераважае альха і бяроза і дол якога проста чырванее ад суніц. А падайся ў балоцісты гушчар дык маліны і ажыны процьма (І. Навуменка).

**Практыкаванне № 70.** Прачытайце тэкст, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Назавіце няпоўныя канструкцыі, укажыце магчымыя пунктуацыйныя варыянты.

Зала – як суцэльны грот з кветак. На спінках крэслаў гірлянды незабудак, у насценных вазах букеты нарцысаў і цюльпанаў. Столь – як кветкавы шацёр. І каля сцен – маладыя бярозкі.

А на сцэне – дзявочы хор. Ніжэй – вясковы аркестр.

Кумы з дзецьмі садзяцца парамі, каля праходу. І хор пачынае спяваць. Песні яго – тыя песні, што спявае народ пра дзіцянятка, пра маці, пра будучы лёс немаўлятка. Музыка, водар кветак. Усе сядзяць расчуленыя (У. Караткевіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ